*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# НАША СЛОВА

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года

№ 51 (942) 23 СНЕЖНЯ 2009 г.

# З Калядамі, шаноўныя беларусы!




Куцця. Марозна. Хмурнавата.
Сняжок падкідвае заўзята;
Снег на Куццю —
грыбы на лета,
Такая матчына прымета,
А сцежкі чорны — ягад многа
Ну, і за гэта хвала Богу...
... І дроў на свята накалолі,
Трасянкі загадзя натрэслі,
Сянца пахучага прынеслі:
Куцці гаршчок ужо ў калена
Стаяў на лаве, чакаў сена,
І вось цяпер
гаршчок з куццёю,
Як цар даўнейшаю парою,
Ў пачэсны кут,
на свой прастол,
Стаўляўся з гонарам за стол
На гэта сена пад багамі,
Ўладар над хлебам і блінамі,
Бо ён у гэты дзень — персона!
Яго вянчаў абрус-карона:
Гаршчок агорнуты пашанай,
Хоць ён фаміліі глінянай.
Якія ж матчыны намеры
Наконт куцці, наконт вячэры?
Ох, гэта дзецям знаць цікава,
Калі якая будзе страва,
Ў якім ліку, ў якім парадку?
Што на канцы і што ўпачатку?
А ў маткі ўсё абмеркавана
І ўсё прадумана ад рана...
... Маўчком Антось
часінай шэрай
У ельнячок
шмыгнуў з сякерай:
Ці ж ён звярэдзіцца,
сагрэшыць,
Калі малых дзяцей пацешыць
І іх ялінкай пад куццю
Хоць раз забавіць у жыццю,
Калі забавіць толькі зможа?
Ялінка ў хаце так прыгожа!
І колькі радасці і ўцехі!
На ёй валоскія арэхі,
А з пазалочанай паперкі
Глядзяць панадныя цукеркі;
І больш на ёй няма нічога,
Ды хіба ж дзецям трэба многа?

***Якуб Колас.***

ISSN 2073-7033

# Станіславу Шушкевічу - 75

***̈н паказаў, што кіраваць Беларуссю можна і трэба на беларускай мове***

**ШУШКЕВІЧ Станіслаў Станіслававіч** (н. 15.12.1934, Менск), бел. фізік, дзярж. дзеяч. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1991). Д-р фіз.-матэм. н. (1970), праф. (1972). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1982). Сын паэта С.П.Шушкевіча. Скончыў БДУ (1956). З 1956 у Ін-це фізікі АН Беларусі, на Менскім радыёзаводзе. У 1961- 67 і 1969-90 у БДУ (з 1971 заг. кафедры, з 1986 прарэктар). У 1967—69 у Менскім радыётэхн. ін-це (прарэкгар).

У 1989-91 нар. дэп. СССР. У 1990-96 дэп., у 1990-91 1-шы нам. Старшыні, у 1991-94 Старшыня Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь. З 1994 дырэкгар Цэнтра паліт. і эканам. даследаванняў Еўрап. гуманітарнага ун-та (Менск). Разам з кіраўнікамі Расіі і Украіны падпісаў Белавежскія пагадненні 1991 аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Навук. працы па радыёфізіцы, опта- і ядз. электроніцы. Адзін з аўтараў асноватворных прац па аднаэлектроннай фотарэгістрацыі. Развіў метады электроннай інтраскапіі, спосабы візуалізацыі і каардынатаадчувальныя цвердацельныя дэтэкгары іанізавальных выпрамяненняў. Дзярж. прэмія Беларусі 1988. Сябар ТБМ.




*Мая маці сваё здароўе паклала, каб нас выгадаваць. Яна закончыла педінстытут, спачатку працавала ў Койданаве — была кіраўніком мясцовай самадзейнасці. Была членам саюза пісьменнікаў СССР — на білеце членскім подпіс Горкага стаіць. Друкавалася пераважна на польскай мове...*

*... Маці ў 1980-м годзе памерла. Заўсёды вучыла мяне ўспрымаць рэчаіснасць спакойна. Гэта яна мяне пераканала стаць фізікам. Маці ўвесь час гаварыла пра «сапраўдную адукацыю» — лекараў, біёлагаў, фізікаў. Мая настаўніца расійскай мовы потым наракала на мяне. Маўляў, выбраў фізіку, а не лірыку.*

*Сябе я памятаю з 1936-га. Тады якраз памёр мой дзед, а ў дзіцячай памяці адкладіся яго боты. У садзе мы ставілі самавар і яго гарачая труба аднойчы прыпаліла мне нагу, а дзед мяне суцяшаў. Вось з таго моманту мне боты дзедавы і запомніліся.*

*Недзе напрыканцы 1939-га я навучыўся чытаць, і маці пачала даваць мне бацькавы лісты [бацька сядзеў у савецкім канцлагеры — Рэд.]. Можна было раз у месяц дасылаць лісты. Я добра памятаю, **як адказваў яму на беларускай мове...***

*... Калі падпісалі Белавежскія пагадненні, спачатку ніякага адчування не было асаблівага. Тады я ўжо быў крыху дасведчаным чалавекам у гістарычным плане.*

*Для мяне галоўным было тое, што Расія прызнае незалежнасць Беларусі. Для Ельцына зусім іншае важна было. Таму ён у 1997 годзе публічна пашкадаваў аб тых пагадненнях.*

*Было неабходна адразу паставіць дакументы на разгляд Вярхоўнага Савета. Я добра разумеў, што калі белавежскія пагадненні не ратыфікуюць — гэта будзе канцом маёй кар'еры. Адзін выраз «СССР перастае існаваць» чаго варты быў...*

*Станіслаў Шушкевіч,*
*(вытрымкі з інтэрвію).*

# 75 гадоў з дня нараджэння Івана Чыгрынава



**ЧЫГРЫНАЎ Іван Гаўрылавіч** (21.12.1934, в. Вялікі Бор Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 5.1. 1996), бел. пісьменнік. Нар. пісьменнік Беларусі (1994). Скончыў БДУ (1957). З 1957 працаваў у выд-ве «Навука і тэхніка», з 1962 у час. «Полымя». З 1975 нам. старшыні, з 1976 сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1987 старшыня праўлення Бел. фовду культуры, адначасова з 1989 гал. рэдактар час. «Спадчына». Друкаваўся з 1952. Пачаткам літ. дзейнасці сам Ч. лічыў 1961, калі было апублікавана апавяд. «Праз гады». У зб-ках апавяд. «Птушкі ляцяць на волю» (1965), «Самы шчаслівы чалавек» (1967), «Ішоў на вайну чалавек» (1973), «Ці бываюць у выраі ластаўкі» (1983) і інш. паказана духоўная прыгажосць чалавека ў мірных і ваен. умовах. Раманы «Плач перапёлкі» (1970), «Апраўданне крыві» (1976, за абодва Літ. прэмія імя А. Фадзеева 1979), «Свае і чужынцы» (1983), «Вяртанне да віны» (1992) і «Не ўсе мы згінем» (1996) звязаны аднымі героямі і месцам дзеяння (вёска Верамейкі, таму наз. «верамейкаўскі цыкл»). У іх адлюстравана атмасфера ваен. часу, вясковы побыт на акупаванай тэрыторыі, арганізацыя падполля, зараджэнне партыз. руху, даследаваны вытокі гераізму і мужнасці бел. народа, створаны яркія вобразы патрыётаў перыяду Вял. Айч. вайны. Паводле сваіх раманаў і апавяд. Ч. стварыў п'есы «Плач перапёлкі» (паст. 1980, Бел. т-р імя Я. Купалы), «Апраўданне крыві» (паст. 1984, Брэсцкі абл. драм. т-р), "Дзівак з Ганчарнай вуліцы" (паст. 1986, Тэатр-студыя кінаакцёра). Аўтар п'ес «Следчая справа Вашчылы» (1988, пра кіраўніка Крычаўскага антыфеад. паўстання 18 ст.), «Звон - не малітва» (паст. 1988, т-р імя Я. Купалы; пра княгіню Рагнеду), «Чалавек з мядзведжым тварам» (1989, погляд на эпоху Сталіна). У трагічным гратэску «Ігракі» (1990) перадваен. падзеі. Драм. фантазія «Хто вінаваты?», абразок «Толькі мёртвыя не вяртаюцца» пра Чарнобыль і звязаныя з ім праблемы. П'еса «Прымак» (1994) і драм. аповесць «Брат караля» (1995) пра бел. дзяржаўнасць часоў ВКЛ. Драма «Савіцкі» (1994) пра заступніка абяздоленых, «бел. Дуброўскага». У трагікамедыі «Госці» (паст. 1994, т-р імя Я.Купалы) аналіз стану грамадства пач. 1990-х г. П'еса «Зайграй, хлопча малы» (1995) пра бел. паэта П. Багрыма. Творчасці Ч. ўласцівы глыбокі дэталёвы аналіз унутр. свету чалавека, паэтычнасць, рэаліст. канкрэтная вобразнасць, высокая культура слова. Аўтар манаграфіі «М.Я. Нікіфароўскі» (1960, з В.К. Бандарчыкам), крытыка-публіцысгычных кніг «Новае ў жыцці, новае ў літаратуры» (1983), «Паміж сонцам і месяцам: Роздум над жыццём, культурай і літаратурай» (1994). На бел. мову пераклаў п'есы «На дне» М. Горкага, «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага і інш. Сааўтар сцэнарыя шматсерыйнага тэлефільма «Руіны страляюць...» (1970, з І. Новікавым, Дзярж. прэмія Беларусі 1974). Паводле раманаў «Плач перапёлкі», «Алраўданне крыві», «Свае і чужынцы» рэж. І.Дабралюбаў на кінастудыі «Беларусьфільм» стварыў шматсерыйны тэлефільм «Плач перапёлкі» (1991). Па матывах рамана «Плач і пёлкі» У. Кандрусевіч напісаў сімфонію.